**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна
# за люты 2021 г.

## Мерапрыемствы ў рамках месячніка патрыятычнай работы

У бібліятэках прайшлі ўрокі мужнасці, сустрэчы з ветэранамі вайны ў Афганістане і іншыя мерапрыемствы да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і Дня абаронца Айчыны.

**14 лютага**

Падчас тэматычнага вечара «Памяць не сыходзіць у адстаўку» бібліятэкары правялі экскурс у гісторыю «неаб’яўленай вайны», які суправаджаўся прэзентацыяй. Асаблівая ўвага – землякам, якія ваявалі ў Афганістане. Гучалі «афганскія» песні ў выкананні Алега Сыча і бібліятэкара Таццяны Гурыш.

Дзівінская ПБ, 18 чал.

**24 лютага**

Спартыўна-забаўляльную праграму «Аты-баты, мы будучыя салдаты» бібліятэкары прысвяцілі Дню абаронца Айчыны. Дзеці, падзяліўшыся на дзве каманды, удзельнічалі ў шасці турах спаборніўцтваў на самага трапнага, трывалага, спрытнага, хуткага, адказвалі на пытанні вайсковай віктарыны. Завяршылася мерапрыемства чаяваннем.

Гарадзецкая ПБ, 26 чал.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага дня роднай мовы

Да Міжнароднага дня роднай мовы ў бібліятэках прайшлі літаратурна-музычныя праграмы, выступленні ЛПГ, урокі роднай мовы, літаратурныя гадзіны і іншыя мерапрыемствы.

**18 лютага**

Падчас літаратурнай гадзіны «Сябруй з роднай мовай» вучні Стрыгаўскага дзіцячага сада – сярэдняй школы сустрэліся з членам літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Нінай Пучык. Бібліятэкар зрабіла агляд кніжнай выставы, на якой побач з творамі класікаў беларускай літаратуры размяшчаліся і публікацыі ў СМІ мясцовай паэткі.

Стрыгаўская ПБ, 23 чал.

**19 лютага**

На ўрок роднай мовы «Як даўні скарб, як спадчына, нам даравана мова матчына» ў бібліятэку завіталі школьнікі. Яны выконвалі заданні «Знаўцы», «Перакладчыкі», «Эрудыты-мовазнаўцы», «Творцы», прынялі ўдзел у «Конкурсе паэтаў».

Балоцкая ПБ, 14 чал.

**21 лютага**

У традыцыйным раённым конкурсе беларускай паэзіі і песні «Беларуская мова – мелодыя душы», арганізаваным Залескай бібліятэкай і цэнтрам культуры і вольнага часу прынялі ўдзел 36 канкурсантаў. Конкурс праходзіў у дзвюх намінацыях: «Песня» і «Паэзія». Першы этап праводзіўся завочна: журы прагледзела конкурсныя работы, знятыя на відэа. Другі этап прайшоў у фармаце гала-канцэрта пераможцаў, у завяршэнні якога адбылося ўзнагароджанне.

Залеская ПБ, 105 чал.

**21 лютага**

Міжнародны дзень роднай мовы ў бібліятэцы адзначылі вусным часопісам «Сэрцам роднага слова краніся». Дзеці «адкрывалі» старонкі «Адкуль яны родам», «Падумай і адкажы», «Прыказкі і прымаўкі», «Паспрабуй перакладзі», склалі кветку-прызнанне роднай мове, даспадобы прыйшлася гульня «Назаві слова», прагледзелі відэакліп «Дзяўчынка-беларусачка» пазнаёміліся з падборкай кніг беларускіх аўтараў «Сябруем з беларускай кнігай» і узялі іх дамоў пачытаць.

Арэхаўская ПБ, 23 чал.

**22 лютага**

Пад дэвізам «З любоўю да роднага слова» прайшла сустрэча вучняў 5 «В» класа гімназіі г. Кобрына з бібліятэкарам аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі, кіраўніком літаратурнага клуба «ПаэтыКо», пісьменніцай Наталляй Кандрашук (Ефціфеевай). Дзеці слухалі вершы, лічылкі і казкі, актыўна адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў конкурсе па вымаўленню хуткамовак на беларускай мове.

ЦБ, 20 чал.

**24 лютага**

На літаратурнае свята «Беларуская скарбонка» ў бібліятэку завітала Моваведка, якая расказала шмат цікавага з гісторыі беларускай мовы. А ў скарбонцы дзеці знайшлі шмат беларускамоўных жартаў, загадак, прыказак, прымавак і казак. Да спадобы прыйшліся і беларускія гульні, у якіх яны ўдзельнічалі. Да свята прымеркавана кніжная выстаўка «Слова жывое, роднае, гаваркое... ».

Тэвельская ПБ, 40 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**5 лютага**

Да 100-годдзя з дня нараджэння І. Шамякіна Залеская публічная бібліятэка правяла анлайн-марафон «Чытаем Шамякіна разам». Удзельнікі марафону прапанавалі слухачам урыўкі з любімых твораў беларускага

пісьменніка «Крыніцы», «Злая зорка», «Ах, Міхаліна, Міхаліна», «Глыбокая плынь», «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», апавяданне «Вышыня» і іншыя.

Залеская ПБ, 17 чал.

**9 лютага**

Аб’яўлены раённы конкурс відэапрэзентацый «Гонар маёй вёскі» сярод публічных бібліятэк раёна.

ЦБ

**12 лютага**

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі прапанаваў наведвальнікам бібліятэчнага сайта, груп у сацыяльных сетках і падпісчыкам канала на «Ютубе» віртуальную кніжную выстаўку «Читаем книги о любви».

ЦБ

**14 лютага**

Гадзіна паэзіі «Усё пачынаецца з кахання» прайшла ў бібліятэцы. Прысутныя чыталі лірычныя творы вядомых паэтаў і ўдзельнічалі ў музычным конкурсе «Каханне ўсяму пачатак».

Балоцкая ПБ, 10 чал.

**14 лютага**

Бібліятэкары запрасілі юных чытачоў на майстар-клас па вырабе паштовак «Лаві валянцінку!». Для ўдзельнікаў мерапрыемства зроблены агляд выстаўкі часопісаў «Лукошко идей», «Мастерица», «Ксюша», «Валя-Валентина», «Ксюша. Умелые ручки», у якіх ёсць інструкцыі, як рабіць «валянцінкі». Затым дзеці самастойна выраблялі паштоўкі для Дня закаханых.

Гарадзецкая ПБ, 11 чал.

**15 лютага**

Адбылося ўзнагароджанне пераможцаў раённага конкурса маладзёжнай паэзіі і прозы «Пробуждение музы», на які журы атрымала 20 твораў. Пераможцы вызначыліся ў дзвюх узроставых намінацыях: 10 – 14 і 15 – 35 гадоў, у якіх дыпломы і прызы ад партнёраў конкурсу атрымалі Ганна Радзівіновіч і Наталля Стаськевіч адпаведна.

ЦБ, 12 чал.

**17 лютага**

Адбылася прэзентацыя відэафільма «Славутыя імёны маёй малой радзімы», падрыхтаванага бібліяёграфамі бібліятэкі. Гэта выніковы фільм па рабоце над краязнаўчым біябібліяграфічным асветніцкім праектам пад аднайменнай назвай. Відэафільм асвятляе ўсе этапы работы, яго вынікі.

ЦБ, 35 чал.